**КАДЭТЫ**, к.-д.., канстытуцыйна-дэмакратычная партыя, партыя «народнай свабоды». Арганізацыйна аформлена ў рэвалюцыю 1905—07, заняла месца на левым флангу расійскага лібералізму. Склалася з арг-цый «Саюза вызвалення» і «Саюза земцаў-канстытуцыяналістаў» (засн. ў 1903—04). Устаноўчы з'езд К. адбыўся ў кастр. 1905. Ён залажыў асновы арганізац. структуры партыі, прыняў праграму і статут, абраў ЦК. На 2-м з'ездзе ў студз. 1906 адбылося канчатковае канстытуіраванне партыі. Прынята рашэнне дадаць да асн. назвы партыі «канстытуцыйна-дэмакратычная» словы «партыя «народнай свабоды», абраны новы склад ЦК, унесены змены ў праграму і статут. З 1905 па 1917 адбылося 10 з'ездаў партыі. ЦК партыі К. складаўся з Пецярбургскага і Маскоўскага аддзелаў і выбіраўся агульным з'ездам партыі тэрмінам на 1 год. У губернях ствараліся губ. к-ты, якія выбіраліся губ. з'ездамі партыі. У сваю чаргу губ. к-ты мелі права ствараць гар., пав. і вясковыя к-ты. Вядучую ролю ў партыі К. адыгрывалі Павел Д. і Пётр Д. Даўгарукавы, П.М.Мілюкоў, П.Б.Струве, І.І.Петрункевіч, А.І.Шынгароў, М.В.Сабашнікаў і інш. У партыю К. уваходзілі прадстаўнікі інтэлігенцыі, частка памешчыкаў, сярэдняя гар. буржуазія. У рэвалюцыі 1905—07 у мясц. парт. арг-цыі ўваходзілі і прадстаўнікі сац. нізоў: рабочыя, рамеснікі, служачыя, сяляне. Найб. аптымальным варыянтам грамадскага прагрэсу К. лічылі капіталізм. Выступалі супраць гвалтоўных сац. пераваротаў, за эвалюцыйнае развіццё грамадства. Патрабавалі замены неабмежаванага самадзяржаўнага рэжыму канстытуцыйна-парламентарнай манархіяй англ. тыпу. Праводзілі ідэю аб падзеле заканадаўчай, выканаўчай, судовай улад, патрабавалі стварэння адказнага перад парламентам урада, рэформы суда, мясц. самакіравання. Выступалі за ўвядзенне ў Расіі ўсеагульнага выбарчага права, ажыццяўленне дэмакр. свабод — сумлення, слова, друку, сходаў, саюзаў і інш. Лічылі, што Расія павінна быць унітарнай дзяржавай з правам культ.-нац. самавызначэння для ўсіх народаў, што насяляюць імперыю, — выкарыстаннем нац. мовы ў школе, судзе, вышэйшых навуч. установах, захаваннем і развіццём л-ры і культуры кожнага народа. У аграрным пытанні К. прапаноўвалі надзяліць зямлёй беззямельных і малазямельных сялян за кошт дзярж., удзельных, манастырскіх зямель, а таксама часткі памешчыцкіх зямель, якія павінны адчужацца за выкуп. К. распрацавалі праграму фінансавых і эканам. рэформаў, вырашэння сац. праблем, развіцця адукацыі і г.д. Афіц. органамі партыі былі газ. «Речь» (тыраж 12—20 тыс. экз.) і штотыднёвік «Вестник партии народной свободы» (выдаваўся ў 1906—08, адноўлены ў 1917). Асн. маса мясц. арг-цый К. узнікла ў перыяд рэвалюцыі 1905—07. У гэты час было 50—60 тыс. членаў партыі. На Беларусі ў 1905—06 арг-цыі К. існавалі ў Магілёве і Пінску. У 1907 яны распаліся, невял. гурткі засталіся ў Мінску, Вільні, Віцебску. Пасля паражэння рэвалюцыі 1905—07 колькасць мясц. арг-цый зменшылася. У 1908—09 у Расіі дзейнічалі 33 губ., 42 пав. к-ты. У 1912—14 к-ты існавалі ў 29 губ. і 32 пав. гарадах. Членаў партыі было каля 10 тыс. У 1-ю сусв. вайну ў Расіі дзейнічала 26 губ., 13 гар. і 11 пав. арг-цый. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 пачаўся працэс адраджэння мясц. арг-цый. У сак.—крас. ў краіне дзейнічала 380 к-таў, колькасць чл. партыі вырасла да 80—100 тыс. чал. На Беларусі ў маі 1917 налічвалася 7 арг-цый, у чэрв. — 10, ліп. — 13, жніўні — 18. Да канца восені 1917 на Беларусі існавала больш за 30 арг-цый. Яны актыўна дзейнічалі ў Мінску, Віцебску, Магілёве, а таксама ў 18 пав. гарадах і 10 нас. пунктах. У жніўні 1917 на Беларусі і Зах. фронце К. былі аб'яднаны ў адзіную арг-цыю, якой кіраваў кадэцкі краявы цэнтр. Пасля перамогі Лют. рэвалюцыі змяніўся сац. склад партыі. У яе ўвайшлі члены памешчыцка-манархічных партый і арг-цый «Саюза 17 кастрычніка», партыі прагрэсістаў і інш. Фактычна партыя К. ператварылася ў цэнтр усіх бурж.-дэмакр. паліт. арг-цый і груповак. Партыя К. актыўна дзейнічала ў перыяд выбарчых кампаній у Дзярж. думу. Іх праграму на Беларусі ў гэты час прапагандавалі газеты «Витебская жизнь», «Могилёвский голос», «Новая заря», «Свободное слово» і інш. У 1-й Дзярж. думе з 36 дэпутатаў ад 5 зах. губерняў (Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай) 10 належалі да партыі К. Пасля Лют. рэвалюцыі К. першымі з усіх паліт. партый Расіі склікалі свой з'езд (за 8 месяцаў 1917 адбыліся 4 з'езды партыі). Яны былі адзінай, акрамя бальшавікоў, буйной агульнарас. партыяй, якая праіснавала да Кастр. рэвалюцыі 1917 без расколу. Пасля стварэння Часовага ўрада К. фактычна сталі правячай партыяй у Расіі, спярша самастойна, а потым у кааліцыі з эсэрамі і меншавікамі. 7-ы з'езд партыі К. унёс змены ў праграму партыі: замест канстытуцыйнай манархіі прызнаў неабходным устанаўленне ў краіне дэмакр. рэспублікі. Састаўнымі часткамі праграмы К. пасля лют. 1917 была ліквідацыя двоеўладдзя, скліканне пасля заканчэння вайны Устаноўчага сходу, які павінен прыняць канстытуцыю, вырашыць пытанне аб дзярж. ладзе і правесці неабходныя для развіцця краіны сац.-эканам. рэформы. Гал. перашкодай на шляху дэмакратыі К. лічылі Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Паліт. эвалюцыя партыі К. да кастр. 1917 прывяла іх да прыняцця ідэі моцнай улады, ваеннай дыктатуры. Пасля перамогі Кастр. рэвалюцыі 1917 дэкрэтам СНК РСФСР ад 28 ліст. (11 снеж.) 1917 партыя К. была аб'яўлена па-за законам. К. падтрымалі белагвардзейскія ўрады Дзянікіна, Калчака, Урангеля. Пасля іх разгрому ў 1920 партыя К. спыніла сваё існаванне ў Расіі. Многія яе кіраўнікі і члены апынуліся ў эміграцыі.

*Літ.:* Астрахан Х.М. Большевики и их политические противники в 1917 г. Л., 1973; История политических партий России. М., 1994; Шелохаев В.В. Идеология и политическая организация российской либеральной буржуазии 1907—1914 гг. М., 1991; Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Ч. 1. Гомель, 1993; Забаўскі М.М. Палітычная барацьба ў Беларусі ў перыяд выбараў у III Дзяржаўную думу // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1987. № 5; Шардыка І.У. Да пытання аб колькасным і сацыяльным складзе арганізацый кадэцкай партыі на Беларусі ў 1917 г. // Весці. Бел. дзярж. ун-та. Сер. 3. 1992. № 3.

*Мікола Забаўскі.*

**КАДЭЦКІЯ КОРПУСЫ** (франц. cadet малодшы), прывілеяваныя сярэднія агульнаадукацыйныя ваенна-навуч. ўстановы для падрыхтоўкі дзяцей дваран (звычайна афіцэраў) да вайсковай службы, пазней — да паступлення ў ваенныя вучылішчы. Узніклі ў Прусіі ў 1653. У Рэчы Паспалітай першым К.к. была Варшаўская школа рыцарства (1765—95), на Беларусі існавалі *Гродзенскі кадэцкі корпус* і *Нясвіжскі кадэцкі корпус.* У Рас. імперыі К.к. пачалі стварацца з т.зв. Корпуса Кадэт у Пецярбургу (1732). У